# Абмеркаванне ў ААН канцэпцыі новага міжнароднага інфармацыйнага парадку ў канцы 1970-х – 1980-я гг.

*Фядотаў Л. А., аспірант БДУ,*
*навук. кір. Снапкоўскі У. Е., д-р гіст. навук, прафесар*

Вытокі канцэпцыі арыентаванага на інтарэсы людзей і адкрытага для ўсіх інфармацыйнага грамадства, сфармуляванай у сістэме ААН у пачатку XXI ст., склаліся ў папярэднія дзесяцігоддзі. 1970–1980-я гг. адметныя рухам развівальных краін, падтрыманых сацыялістычнымі краінамі і шэрагам міжнародных неўрадавых арганізацый (МНА), які быў накіраваны на выкараненне праблемы фактычнай няроўнасці і залежнасці краін у галіне інфармацыі і камунікацыі. Адной з праяваў гэтага руху стала стварэнне ў нетрах Руху недалучэння і развіццё ў межах ЮНЕСКА ідэі новага міжнароднага інфармацыйнага парадку (НМІП). Шырокае абмеркаванне пытанняў усталявання НМІП у ААН пачалося ў 1978 г. з прыняццем рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі «Міжнародныя адносіны ў галіне інфармацыі і масавых сродкаў сувязі», якая абвясціла неабходнасць усталявання больш справядлівага і эфектыўнага міжнароднага парадку ў галіне інфармацыі і сувязі [1, 43–44].

У 1978–1985 гг. у ААН адбылося ўзмацненне дыскусіі адносна стратэгіі вырашэння праблем развівальных краін у інфармацыйна-камунікацыйнай сферы. Пераважная большасць развівальных краін, нягледзячы на адрозненні ў дзяржаўных ідэалогіях, і сацыялістычныя краіны праз рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі і рэкамендацыі Камітэта па інфармацыі бачылі ў НМІП перш за ўсё інструмент пераадолення стану, які дэлегат БССР на 40-й сесіі Генасамблеі Г. Цярноў назваў «інфармацыйным імперыялізмам». Такі падыход да НМІП датычыў галоўным чынам абмену міжнароднай інфармацыяй і прадугледжваў павелічэнне колькасці інфармацыі, якая распаўсюджваецца праз СМІ развівальных краін, увядзенне пэўных крытэрыяў да якасці і зместу міжнароднай інфармацыі, у тым ліку да асвятлення міжнародных праблем, пашырэнне аб’ёму фінансавай і тэхнічнай дапамогі развівальным краінам.

Да 1980 г. прамыслова развітыя краіны ў ААН выказвалі нязгоду з асобнымі элементамі канцэпцыі НМІП, якія стваралі пагрозу ўзмацнення дзяржаўнага кантролю над дзейнасцю СМІ і дыскрымінацыі прыватных СМІ ў параўнанні з дзяржаўнымі. Увогуле ж яны не адмаўлялі слушнасць узнікнення самой ідэі НМІП. Праз МНА некаторыя з іх, напрыклад ФРГ, рабілі спробы выправіць канцэптуальныя падыходы да НМІП [1, 44–57]. У 1978–1980 гг. рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі адносна НМІП прымаліся кансэнсусам. Сітуацыя пагоршылася з пачаткам дзейнасці адміністрацыі

прэзідэнта Р. Рэйгана ў ЗША з яе адмоўным стаўленнем да ўсялякіх спроб стрымлівання вольнага рынку і свабоды інфармацыі. Дыпламатыя ЗША прынцыпова адмаўляла НМІП, галасуючы ў 1981–1989 гг. супраць усіх рашэнняў ААН, дзе ўзгадвалася гэта канцэпцыя. Колькасць краін-праціўнікаў НМІП у ААН пачала імкліва ўзрастаць і дасягнула максімуму ў 1985 г., калі ўсе прамыслова развітыя краіны прагаласавалі супраць адпаведнай рэзалюцыі Генасамблеі альбо ўстрымаліся. Варта адзначыць, што і тэксты рэзалюцый Генасамблеі па гэтай праблеме рабіліся больш шматслоўнымі і катэгарычнымі.




Пачынаючы з 1986 г., фармулёўкі рэзалюцый Генасамблеі па НМІП пачалі змякчацца ў частцы вызначэння НМІП як паступовага і непарыўнага працэсу, чаго асабліва дабіваліся прамыслова развітыя краіны, забеспячэння свабоды шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю, аховы правоў журналістаў, а таксама выключэння рэкамендацый па асвятленні пэўных спрэчных палітычных праблем. Спыненне міжблокавага супрацьстаяння пазбавіла канцэпцыю НМІП ролі значнага фактару ў сусветнай палітыцы, а пачынаючы з 1990 г. рэзалюцыі, прысвечаныя інфармацыі на службе чалавецтва, ухваляліся Генасамблеяй без галасавання.

Такім чынам, з канца 1980-х гг. дзейнасць ААН па ўсталяванні НМІП пераарыентавалася ў бок забеспячэння права краін свету самастойна з улікам уласных прыярытэтаў распрацоўваць сваю дзяржаўную палітыку ў галіне інфармацыі і сувязі з безумоўнай павагай прынцыпу свабоды друку і інфармацыі, супрацоўніцтва арганізацый сістэмы ААН і развітых краін па ўмацаванні інфраструктуры інфармацыі і сувязі ў развівальных краінах,

пашырэнне магчымасцей развівальных краін у вытворчасці ўласнага кантэнту СМІ і сродкаў сувязі [2, 105–106]. НМІП ператваралася з палітычнай канцэпцыі ў сістэму практычных захадаў.

**Литература**

1. A Documentary History of a New World Information and Communication Order Seen As an Evolving and Continuous Process: 1975–1986. – Paris : UNESCO, 1988. – 283 p.

2. Resolutions and Decisions adopted by the General Assembly during its Forty-Fifth Session (18 September – 21 December 1990) / General Assembly Official Records: Forty-Fifth Session. Supplement No. 49 A (A/45/49). – New York : United Nations, 1991. – Vol. I. – 426 p.

## О значении разработки методологии исследования политической идеологии

*Хадаковская Е. В., студ. IV к. БГУ,*
*науч. рук. Михайловский В. С., канд. полит. наук, доцент*

Политическая идеология – это комплексный феномен политической жизни общества. Политическая идеология является системой идей, в которых осмысливается отношение людей к политическому пространству и друг к другу в политике, оцениваются возникающие в жизни общества политические проблемы, конфликты, и на этой основе формируются цели, разрабатываются программы политических действий, направленные на изменение, совершенствование условий, в которых возникают и складываются политические отношения. Сложная структура и многофункциональность политической идеологии делают ее непростым предметом политологического познания. Во-первых, понятие «политическая идеология» однозначно не определено, зависит от научно-исследовательских программ, в которых было генерировано. Во-вторых, все мировые процессы (глобализация, урбанизация, национализация) прямо или косвенно влияют на идеологию и идеологические процессы, трансформируя классические идеологии и идеологические дискурсы. В-третьих, исследования политической идеологии не обеспечены единой и эвристической методологией [1]. Таким образом, политическая идеология как актуальный предмет политических исследований нуждается в комплексном методологическом обеспечении.

Отправным шагом в разработке комплексной методологической базы в исследовании политической идеологии может служить экстраполяция методологии исследования политики на исследования идеологии [2, 19].